# Эстэтыка штодзённасці

## *Прыгажосць у інтэрпрэтацыі беларускіх творцаў*

**Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» запрашае на калектыўную выстаўку *Desing ПАRTall* / 2025 – «Прыгажосць формаў». У экспазіцыі прадстаўлены работы беларускіх дызайнераў, мастакоў, фатографаў, скульптараў і керамістаў.**

На працягу гісторыі чалавецтва паняцце прыгажосці змянялася пад уплывам культур, эпох і светапоглядаў. Яно шматграннае і суб'ектыўнае, бо кожны ўспрымае хараство па-свойму – у залежнасці ад часу, месца і свайго ўнутранага свету.

Са старажытных часоў творцы імкнуліся ў сваіх работах увасобіць прыгажосць. Палеалітычныя Венеры, такія як «Венера з Холе-Фельс» і «Венера Вілендорфская», сімвалізавалі ўрадлівасць і працяг роду – у той час прыгажосць была непарыўна звязана з прыродным пачаткам і інстынктамі выжывання. Пасля грэкі пачалі атаясамліваць прыгажосць з гармоніяй, прапорцыяй і натуральнасцю. У часы Сярднявечча яна набыла духоўнае і рэлігійнае значэнне. Вобразы святых і анёлаў, створаныя выбітнымі мастакамі і скульптарамі, станавіліся сімваламі боскай гармоніі і чысціні. У эпоху Адраджэння гуманізм зрабіў чалавека цэнтрам сусвету, і прыгажосць пачала інтэрпрэтавацца не толькі як знешнія дадзеныя, але і як духоўнае развіццё і станаўленне асобы. XX стагоддзе прынесла новае асэнсаванне прыгажосці праз мадэрніз – мастацкі кірунак, які зруйнаваў традыцыйныя каноны і адкрыў шлях да творчых эксперыментаў. Мастакі адышлі ад класічных партрэта і пейзажа і пачалі шукаць новыя формы выказвання, каб перадаць эмоцыі і ідэі, ствараючы ўнікальную мастацкую мову.



*Юлія Коба «Дакрананне».*

Сёння прыгажосць – гэта не проста знешнасць і модныя тэндэнцыі, а цэлы сусвет ідэй, сэнсаў і эмоцый. Сучасныя мастакі ўзялі лепшае ў папярэднікаў і пашырылі гэтае паняцце. Выстаўка *Desing ПАRTall* / 2025 знаёміць з творчасцю сучасных беларускіх жывапісцаў, скульптараў, дызайнераў, фатографаў, керамістаў і інш. Удзельнікі праекта выкарыстоўваюць аўтарскія тэхнікі і сюжэты, каб адлюстраваць уласны погляд на прыгажосць, заснаваны на багатай гістарычнай традыцыі і індывідуальным успрыманні рэчаіснасці. Іх работы – дыялог паміж мінулым і сучаснасцю, унутраным светам і навакольнай рэальнасцю.



*Галіна Санько «Гравітацыйнае поле» і Мікалай Дробыш «Каралёк».*

У экспазіцыі шырока прадстаўлены сучасны беларускі жывапіс. Аўтары Юлія Бортнік, Юлія Коба, Аксана Пахомава, Сяргей Варкін, Ірына Гаспадарская, Галіна Санько, Кацярына Кудашова, Сяргей Бяляўскі і іншыя дэманструюць прыгажосць у розных яе формах і праяўленнях. Мастакі звяртаюцца да традыцыйных жанраў – нацюрморта, пейзажа, партрэта, а таксама да эксперыментальных формаў – інсталяцый, абстрактнага і канцэптуальнага мастацтва. Сюжэтамі для твораў сталі беларускія краявіды, летнія і восеньскія нацюрморты, паўсядзённыя сцэны з жыцця вясковага і гарадскога чалавека. У абстракцыі знайшла сваё адлюстраванне ўнутраная прыгажосць чалавечай душы, хараство такіх пачуццяў, як каханне, пяшчота, вернасць і інш.

Жывапісныя работы спалучаюцца са скульптурамі Мікалая Дробыша, у якіх аўтар імкнецца перадаць гармонію сусвету і зрабіць акцэнт на простых рэчах. Бо менавіта ў паўсядзённай рэчаіснасці хаваецца сапраўдная прыгажосць.



*Андрэй Лагун «Ружовы аксаміт».*

На выстаўцы прадстаўлены творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў выкананні Юрыя Фурса, Івана Кірэйцава, Кацярыны Хадасевіч і іншых. Канцэптуальныя работы майстроў скіроўваюць на пошук прыгажосці ў недасканалым, у тым, што звычайна застаецца па-за ўвагай, але нясе ў сабе паэзію формы і фактуры.

Выставачны праект «Прыгажосць формаў» прапануе наведвальнікам самастойна адшукаць эстэтыку штодзённасці, якая можа стаць крыніцай натхнення і глыбокіх разважанняў.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**
**Фота аўтара**

**Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:**

| | |
|---|---|
| **29 верасня** | у бібліятэку № 1 імя Л. М. Талстога (вул. Маскоўская, 18) на літаратурна-музычную імпрэзу «Залатая восень» да дня чалавека сталага ўзросту з удзелам сучасных беларускіх пісьменнікаў. Пачатак |